# ІНТЭРАКТЫЎНЫ ПЛАКАТ ЯК СРОДАК ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ (на матэрыяле тэмы “Мая Радзіма — Беларусь”)

*Ягадка Алена Генадзьеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле прадстаўлены матэрыял для правядзення заняткаў з выхавацелямі дашкольнай адукацыі. Аўтарам распрацаваны алгарытм стварэння і выкарыстання інтэрактыўнааг плаката на вучэбных занятках у сістэме дашкольнай адукацыі. Раскрываюцца асаблівасці працэсу стварэння інтэрактыўнага плаката з выкарыстаннем сервіса LearningApps на матэрыяле грамадзянска-патрыятычнай тэматыкі.*

Укараненне сучасных тэхналогій, інавацыйных форм, метадаў і прыёмаў навучання ў сістэму дашкольнай адукацыі дазваляюць хутка і эфектыўна дасягнуць станоўчых вынікаў. Прымяненне сучасных сродкаў візуалізацыі ў адукацыйным працэсе дапамагаюць дзіцяці дашкольнага ўзросту пазнаёміцца з разнастайным па характары матэрыялам, даведацца пра вядомых людзей, славутыя мясціны, родны горад, прыроду Беларусі, культурныя традыцыі беларусаў (ткацтва, лазапляценне, саломапляценне, народны касцюм і г.д.). Інтэрактыўныя плакаты з'яўляюцца выдатнай дапамогай у працэсе правядзення заняткаў. Яны не толькі могуць утрымліваць багаты матэрыял, але і здольныя прадастаўляць яго ў нагляднай, інтэрактыўнай форме. Дзякуючы гэтаму можа быць вырашана адна з найважнейшых задач адукацыйнага працэсу ў сістэме дашкольнай адукацыі — уключыць выхаванцаў у актыўную пазнавальную дзейнасць, навучыць дзіця бачыць прыгожае і здзіўляцца. На першы погляд, некаторыя элементы могуць быць яшчэ не зусім зразумелымі дзіцяці, аднак яны абавязкова пакінуць след і акажуць станоўчае ўздзеянне на фарміраванне асобы.

Кожны з педагогаў разумее, што выхаванне каштоўнаснага стаўлення да сваёй Радзімы пачынаецца з таго, што бачыць вакол дзіця. Прапанаваны сцэнарый заняткаў на тэму “Мая Радзіма — Беларусь” з прымяненнем прыёмаў візуалізацыі (інтэрактыўны плакат) адрасаваны выхавацелям дашкольнай адукацыі.

**Мэта:** павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці педагагічных работнікаў дашкольнай адукацыі ў сістэме грамадзянска-патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту праз прымяненне сродкаў візуалізацыі (інтэрактыўнага плаката).

**Задачы:**

пазнаёміць педагогаў з тэхналогіяй стварэння інтэрактыўнага плаката з дапамогай сервіса LearningApps;

раскрыць асаблівасці выкарыстання інтэрактыўных формаў і прыёмаў на занятках грамадзянска-патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту;

матываваць педагогаў да актыўнай творчай дзейнасці;

стварыць ўмовы для прафесійнага самаўдасканалення педагагічных работнікаў.

**Матэрыял і абсталяванне:** канверты з QR-кодамі, мультымедыйная прэзентацыя, інтэрактыўны плакат з практыкаваннямі сервіса LearningApps, кветка “Васілёк”.

**Удзельнікі:** выхавацелі дашкольнай адукацыі.

Удзельнікам загадзя раздаюцца канверты з QR-кодамі. Удзельнікі размяркоўваюцца на дзве групы па колеры QR-кодаў і займаюць месцы за сталамі.

***Слова да ўдзельнікаў.***

Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца асновай выхаваўчага працэсу. Падзяліцца вопытам і ідэямі для павышэння эфектыўнасці адукацыйнага працэсу з выкарыстаннем інавацыйных прыёмаў — асноўная ідэя нашай сустрэчы.

Кожнаму чалавеку трэба ведаць, хто ён і адкуль, памятаць пра свае карані. Любоў да свайго народа, роднай зямлі робіць чалавека больш годным і моцным. Каб нашы дзеці раслі паспяховымі, упэўненымі ў сабе людзьмі, трэба з самага ранняга ўзросту прывіваць ім пачуццё павагі да роднай краіны і народа.

Прапануецца ўспомніць асноўныя паняцці, якія ўключаюцца ў змест працы па грамадзянскім і патрыятычным выхаванні, праз адказы на пытанні.

*1. Асаблівы палітычны інстытут, які забяспечвае сацыяльную абароненасць насельніцтва, абарону і бяспеку краіны?* (Дзяржава).

*2. Айчына, краіна, у якой жыве чалавек і нарадзіўся?* (Радзіма).

*3. Чалавек, які любіць сваю краіну?* (Патрыёт).

Дзіцячы сад — гэта месца, дзе дзіця атрымлівае вопыт шырокага эмацыйна-практычнага ўзаемадзеяння з дарослымі і аднагодкамі. Кіруючы дзейнасцю дзяцей, мы, педагогі, знаёмім выхаванцаў з сімваламі дзяржавы, гістарычнымі асобамі, развіваем цікавасць да народных традыцый, фарміруем павагу да людзей іншых нацыянальнасцей. Перш за ўсё любоў да Радзімы пачынаецца з паважлівага стаўлення да самых блізкіх людзей — бацькі, маці, бабулі, дзядулі, з павагі да свайго дома, вуліцы, на якой дзіця жыве, дзіцячага сада, школы, горада. Усяму гэтаму мы імкнемся навучыць дзіця.

У рабоце з дзецьмі дашкольнага ўзросту выкарыстоўваюцца разнастайныя сродкі навучання і выхавання. Актыўна ўключыць выхаванцаў у пазнавальную дзейнасць дазваляе інтэрактыўны плакат. Інтэрактыўны плакат — гэта спосаб візуалізацыі інфармацыі на аснове аднаго малюнка, да якога прымацоўваюцца спасылкі на вэб-рэсурсы і інтэрнэт-дакументы, мультымедыйныя аб'екты: відэа, аўдыё, прэзентацыі, слайд-шоў, гульні і г. д. Перавага інтэрактыўнага плаката над іншымі сродкамі нагляднасці ў тым, што ён

дапамагае засяродзіць увагу на асноўных паняццях, наглядна іх прадэманстраваць, засвоіць, замацаваць і сістэматызаваць матэрыял па абранай тэме і пры гэтым актыўна ўключаць гадаванцаў у працэс пазнання.

Асаблівую ўвагу у працы на занятках ва ўстановах дашкольнай адукацыі з электроннымі сродкамі навучання неабходна надаць працягласці іх выкарыстання (патрабаванні адзначаны ў зменах і дапаўненнях пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 жніўня 2019 года № 525 ад 26 верасня 2024 года № 663 у табліцы № 2 “Рэжым працы з электроннымі сродкамі навучання”). Для дзяцей ва ўзросце ад 5 да 6 гадоў колькасць заняткаў з выкарыстаннем электронных сродкаў навучання не павінна перавышаць больш за 2 разы на тыдзень. Працягласць бесперапыннага занятку, звязанага з фіксацыяй погляду на відэаманіторы пры выкарыстанні інтэрактыўнай дошкі, 5 хвілін, сумарная працягласць 15 хвілін.

Прадстаўлены інтэрактыўны плакат зроблены з дапамогай сервіса LearningApps. LearningApps прызначаны не толькі для працы з гатовымі шаблонамі, але і для стварэння ўласнага кантэнту з дабаўлением спасылак, пытанняў, відэа-, аўдыёфайлаў і г.д. LearningApps захоўвае ўсю інфармацыю ў воблаку, таму працягнуць працу з сэрвісам можна на любым камп’ютары.

У кожнага з удзельнікаў ёсць QR-код, з дапамогай якога можна адкрыць плакат на ноўтбуку (кожная каманда скануе QR-код, адкрывае плакат). Далей на канкрэтным прыкладзе разглядаюцца этапы стварэння і напаўненне інтэрактыўнага плаката.

**Першы этап** у стварэнні інтэрактыўнага плаката – гэта фармулёўка тэмы, вызначэнне мэты стварэння плаката, мэтавай аўдыторыі. Каманды атрымліваюць заданне прыдумаць назву інтэрактыўнаму плакату, мэту яго выкарыстання на вучэбных занятках.

Прадстаўлены ўзор інтэрактыўнага плаката складаецца з 4 рубрык:

*Сям’я.*
*Беларусь – мая старонка.*
*Мой горад Полацк.*
*Назаві выраб народнага рамяства.*

Удзельнікі выходзяць праз QR-код на старонкі інтэрактыўнага плаката LearningApps і атрымліваюць наступнае заданне.

**Другі этап** сумеснай працы – сфармуляваць мэту і распрацаваць умову выканання практыкаванняў для выхаванцаў на аснове прапанаванага зместу старонак інтэрактыўнага плаката. Мэта павінна адпавядаць узросту дзяцей, заданні быць даступнымі і зразумелымі дзецям. Удзельнікам можна карыстацца вучэбнай праграмай (каманды выконваюць заданне).

***Слова да ўдзельнікаў:***

Усе мы ведаем, што першая ступень выхавання – гэта сям’я. У сям’і дзіця вучыцца любіць, спачуваць. Ва ўмовах сям’і складаецца эмацыйна-маральны досвед. Вельмі важна давесці бацькам, што развіццё асобы дзіцяці не павінна ісці стыхійным шляхам. Такім чынам, першая старонка інтэрактыўнага плаката ***“Сям’я” (малюнак 1).***

*Матулька, татуля, бабулька, дзядуля, сястрычка,*
*і брат мой, і я – усіх нас сямёра, у згодзе,*
*без гора жыве-пажывае сям’я.*
*У хаце й ля хаты з нас кожны заняты;*
*як пчолы ці як мурашы,*
*сваёй талакою на фоне спакою*
*шчыруем штодня ад душы.*
*Спраўляючы святы, мы песень багата*
*спяваем усёю сям’ёй,*
*Любоў тут пануе.*
*Сямейку шануе з нас кожны ўсёю душой.*
*(В. Жуковіч)*

Наступная частка інтэрактыўнага плаката называецца ***“Беларусь – мая старонка” (малюнак 2).***




Малюнак 1. – Скрыншот старонкі інтэрактыўнага плаката “Сям’я”




Малюнак 2. – Скрыншот старонкі інтэрактыўнага плаката "Беларусь – мая старонка"

*Твая Беларусь*
*На карце вялікага свету*
*Яна як кляновы лісток,*
*Песня гарачага лета,*
*Крынічнай вады глыток.*
*І ты яе запомні імя,*
*Як неба, сонца і зару.*
*Твая зямля, твая Радзіма*
*Названа светлая: Беларусь! (Ю. Свірка)*

Камандам прапануецца знайсці герб вобласці і злучыць яго з асноўным элементам.

Наступная старонка інтэрактыўнага плаката ***"Мой горад Полацк" (малюнак 3).***

*"Нам, дзецям Полацкай зямлі..."*
*Нам, дзецям Полацкай зямлі,*
*Пашчасціла там нарадзіцца,*
*Дзе Рагвалод калісь хадзіў,*
*Скарына пачынаў вучыцца.*
*Дзе крокі першыя, як мы,*
*Рагнеда, Сімяон рабілі,*
*Там, дзе насупраць сілам злым,*
*За шчасце нашае малілі.*
*Сабор Сафійскі – карабель,*
*Плыве Дзвіной у гордай плыні*
*Ды толькі з-за чужых зямель*
*Любімы горад не пакіне.*




Малюнак 3. – Скрыншот старонкі інтэрактыўнага плаката "Мой горад Полацк"

*Барысаў камень з тых вякоў*
*Стаіць ля вечнае Сафіі.*
*І нешта кліча зноў і зноў*
*Пабыць ля слаўнае святыні.*
*На ўзбярэжжы Палаты*
*Царква святое Еўфрасінні.*
*Прыдзі сюды і ўбачыш ты:*
*Над ёй аблокі ў небе сінім.*
*Хай будзе неба над табой*
*Заўсёды чыстым, горад мілы.*
*Хто да цябе з мячом прыйшоў,*
*Тут і знайшоў сваю магілу.*
*Нідзе на свеце не знайсці*
*Такой красы, такой прыроды.*
*Цябе заўсёды буду сніць.*
*Люблю цябе, мой горад родны. (А. Баханькоў)*

Апошняя старонка плаката ***"Назаві від народнага рамяства" (малюнак 4)***. Знаёмства дзяцей з вырабамі народных майстроў дазваляе зацікавіць іх беларускай культурай, пазнаёміць з мінулым і сучаснасцю нашага народа, дапамагае засвоіць звычаі і традыцыі, якія перадаюцца з пакаленнямі.

Удзельнікам каманд неабходна прыдумаць подпісы да кожнага малюнка.

**Трэці этап** працы. Удзельнікам прапаноўваецца падрабязная інструкцыя-памятка па стварэнні інтэрактыўнага плаката ў праграме LearningApps. Кожны можа пакарыстацца памяткай з дапамогай QR-кода і стварыць свой інтэрактыўны плакат, прыдумаць заданні, расказаць, якім зместам яго можна напоўніць.

**Чацвёрты этап** працы каманд. Падвядзенне вынікаў уключае абмеркаванне прадстаўленых камандных ідэй па тэматыцы інтэрактыўных плакатаў, абмен уражаннямі (педагогі перадаюць васілёк з пажаданнямі адзін аднаму).

Такім чынам, крытэрыямі эфектыўнасці работы па грамадзянскім і патрыятычным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца станоўчая дынаміка асобаснага росту дзяцей, павышэнне іх інфармацыйнай і краязнаўчай дасведчанасці, праяўленне цікавасці дзяцей і бацькоў да гісторыі і культуры роднага краю, сваёй краіны. Вынікам сваёй працы педагогі лічаць станоўчы ўплыў выкарыстання ў працэсе грамадзянскага і патрыятычнага выхавання дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, а менавіта – сродкаў візуалізацыі інфармацыі. Выкарыстанне інтэрактыўных плакатаў, прымяненне QR-кодаў, якія змяшчаюць дадатковую інфармацыю, дазваляе паказаць культурныя каштоўнасці Беларусі ў даступнай для выхаванцаў форме, развіваць цікавасць да роднага краю і беларускай мовы.

## Спіс літаратуры

1. Кашлеў, С.С. Технология интерактивного обучения / С.С. Кашлев. – Минск: Белорус. верасень, 2005. – 176 с.

2. Конструктор интерактивных заданий [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://easveta.adu.by/index.php/distancionni-vseobuch/obuchenie-online/servisy-dlya-sozdaniyainteraktivnykh-uprazhneniy/58-learningapps. – Дата доступа: 12.09.2022.

3. Облако слов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://easveta.adu.by/index.php/distancionni-vseobuch/obuchenie-online/sredstva-vizualizatsiiinformatsii/78-oblako-slov. – Дата доступа: 12.09. 2022.

4. Образовательный стандарт дошкольного образования (утв. постановлением Министерства образования Республики Беларусь от 04.08.2022 №228 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-




Малюнак 4. – Скрыншот старонкі інтэрактыўнага плаката "Назаві від народнага рамяства"

uchebnyj-god/doshkolnoe-obrazovanie?format=html. — Дата доступа: 02.08.2022.

5. Учебная программа дошкольного образования для учреждений дошкольного образования с русским языком обучения и воспитания [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/doshkolnoe-obrazovanie?format=html. — Дата доступа: 10.08.2022.

*Дата поступления в редакцию: 02.08.2024*